

Старонка для юнацтва

# Мы – маладыя

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ’Ю

## З праблемамі і прапановамі – у аддзел моладзі

**Што хвалюе і цікавіць моладзь сёння? Як самую перспектыўную катэгорыю насельніцтва падтрымліваюць у нашым раёне? Чым можна зацікавіць падлеткаў і больш дарослых асоб у вольны час? Пра гэта і многае іншае мы гутарым з начальнікам аддзела па справах моладзі Смаргонскага райвыканкама Таццянай КОПАЧ.**



***- Таццяна, з якімі катэгорыямі моладзі больш за ўсё працуе ваш аддзел?***

- Мы стараемся ахапіць сваёй дзейнасцю як мага больш маладых людзей, але атрымліваецца, што больш за ўсё праектаў рэалізуем сярод працоўнай моладзі. Са школьнікамі і навучэнцамі, акрамя нас, займаюцца школы, упраўленне адукацыі, БРСМ. А мы імкнёмся да таго, каб згуртаваць і зацікавіць менавіта працоўную моладзь. Гэта мы паспяхова рэалізуем праз свой клуб маладых спецыялістаў.

***- Раскажыце, калі ласка, падрабязней пра дзейнасць гэтага клуба.***

- Клуб наш штогод папаўняецца маладымі спецыялістамі, якія прыязджаюць працаваць у Смаргонскі раён. Пасяджэнні мы праводзім штоквартальна. Прычым гэтыя пасяджэнні бываюць вельмі розныя. Напрыклад, у лютым мы хочам запрасіць удзельнікаў клуба і іншых маладых спецыялістаў на вечар адпачынку, прысвечаны дню закаханых. Там жа мы і пазнаёмімся з “навічкамі”. Для маладых спецыялістаў, якія працуюць у аддзеле адукацыі, мы нядаўна праводзілі трэнінг. Абмяркоўвалі розныя педагагічныя прыёмы, як пабудаваць зносіны з вучнямі, як спланаваць свой працоўны дзень, іншыя пытанні. І ўвогуле, якое б мерапрыемства мы ні праводзілі, заўсёды арыентуемся менавіта на маладых спецыялістаў. Гэта дазваляе ім пазнаёміцца, пераняць адзін ад аднаго нейкі станоўчы вопыт, знайсці падобных па духу людзей. Некаторыя застаюцца ў клубе і пасля таго, як губляюць статус маладога спецыяліста, бо іх цікавіць наша дзейнасць.

***- Што новага вы прапануеце для моладзі ў гэтым годзе?***

- О, планаў у нас шмат! Напрыклад, сумесна з ашмянскімі калегамі мы хочам правесці рэгіянальны конкурс цырульніцкага майстэрства. Згодна з палажэннем, якое мы ўжо абмяркоўвалі, маладыя цырульнікі змогуць паказаць сябе ў розных намінацыях: “Жаночая прычоска ў вольным стылі”, “Жаночая прычоска на доўгіх валасах”, “Мужчынская штодзённая прычоска” і “Мужчынская прычоска ў вольным стылі”. Акрамя таго, запланавалі шоу-конкурс “Парад прафесій”. Хочам прадставіць усе прафесіі, якія ёсць у нашым горадзе. Прычым, каб расказалі аб іх самі работнікі: як яны прыйшлі ў прафесію, раскрылі цікавыя рабочыя моманты. А ў маі запросім усіх жадаючых на фестываль сярэдневяковых культур. Гэтае свята робім разам з рыцарскім клубам “Смаргонская харугва”. Калі атрымаецца, хочам ахапіць і гісторыю сярэднявечча, і рыцарскія баі, і танцы. Правесці гэта плануем у парку, зрабіць такое тэматычнае масавае гулянне. У верасні, верагодней за ўсё, правядзём раённы маладзёжны форум, на якім прадставім дзейнасць усіх маладзёжных арганізацый, іх лідараў. Спадзяёмся, усё ў нас атрымаецца.

***- Ці заўсёды моладзь адклікаецца на вашы прапановы?***

- Ведаеце, моладзь - своеасаблівы індыкатар нашай дзейнасці. Калі мы прапануем штосьці сапраўды цікавае і патрэбнае, то абавязкова адклікаецца. А прыемней за ўсё, калі маладыя людзі самі прыходзяць з ініцыятывай. Напрыклад, па прапанове смаргонскіх байкераў Ігара і Анатоля Занковічаў у 2008 годзе мы праводзілі байк-фестываль з удзелам байкераў з Маладзечна, Вілейкі, Смаргоні, Ліды. Атрымалася вельмі цікава. Добра было б паўтарыць такое мерапрыемства. А ўвогуле, калі прыходзіць малады чалавек і прапануе якую-небудзь ідэю, гаворыць, што яму патрэбна для яе рэалізацыі, мы ніколі не адмаўляем.

***- Бывае, чуем, што моладзь скардзіцца на недахоп месцаў для правядзення вольнага часу. Ці згодныя вы з гэтым?***

- Такая праблема, безумоўна, існуе. Але часта яе стварае сама моладзь. У нашым горадзе многа месцаў, дзе можна правесці вечар з сябрамі. І ў той жа час пайсці проста няма куды: не кожны згодны проста пасядзець у бары ці патанцаваць. Што перашкаджае адпачываць культурна, стварыць для сябе патрэбную атмасферу? Дарэчы, мы думалі аб гэтым і паспрабуем сёлета рабіць культурныя праграмы па выхадных на маладзёжных дыскатэках. Напрыклад, у рэстаране “Вілія”. Спадзяёмся, гэта зацікавіць.

***- А часта маладыя людзі звяртаюцца да вас з канкрэтнымі праблемамі?***

- Звяртаюцца, і мы амаль заўсёды ідзём насустрач. Але імкнёмся і папярэдзіць, калі можна так сказаць, іх узнікненне. Нядаўна адбылася сустрэча маладых спецыялістаў з кіраўніцтвам раёна. Напярэдадні гэтай сустрэчы правялі анкетаванне: чаго не хапае, што хвалюе. Прыемна адзначыць, што пераважная большасць маладых работнікаў забяспечана жыллём і дастойным заробкам. Калі ўзнікаюць канкрэтныя пытанні, ёсць дзе атрымаць поўную інфармацыю. Але хочам, каб яны ведалі, што з праблемамі не застануцца сам-насам. Для гэтага і існуе аддзел па справах моладзі, куды яны кожны раз могуць звярнуцца па дапамогу.

НАМ ПІШУТ

## Мысли подростка по поводу и без

Сколько раз я себе повторяла: «Все, с понедельника - новая жизнь!» Наверное, многим это знакомо. С понедельника я буду ложиться спать пораньше, перестану без надобности сидеть в Интернете, начну заниматься физкультурой… Что же мешает мне и другим сделать эти слова не пустыми? Ответ неприятный, но очевидный - слабоволие и лень. Как это губительно… А ведь чтобы избавиться от этого, нужен один шажок, один толчок… Не нужно бояться, что постигнет неудача. Кто не пробует, тот никогда ничего не получает. А каждый день - это знак свыше, который может стать вашим и моим «понедельником». С сегодняшнего дня живу без лени!

* * *

Одиннадцатый класс для младших школьников - вершина из вершин. Например, я с детства мечтала проснуться одиннадцатиклассницей. Не то, чтобы мне были неинтересны другие классы, просто мне казалось, что последний - это что-то необычное, грандиозное. Ты самый старший в школе, на тебе лежит большая ответственность. Когда я была в классе, скажем, восьмом, смотрела на старшеклассников снизу вверх, казалось, будто они и знают в тысячу раз больше, и жизнь у них интереснее. А оказалось, что жизнь эта скорее сложнее. Ведь одиннадцатый класс - это последняя «ступенька», как любят повторять наши учителя, отправной пункт во взрослую жизнь. Что дальше, пока неизвестно. А пока давайте наслаждаться моментом!

**Валерия КАРАБИНСКАЯ, ученица 11 класса школы № 5.**

СУСТРЭЧЫ, ЯКІХ ЧАКАЮЦЬ

## Гульня на роўных

**Цікавая спартыўная “бітва” адбылася нядаўна на базе школы №7. Супрацоўнікі міліцыі “кінулі выклік” сваім падапечным з прафесійна-тэхнічнага ліцэя – прапанавалі правесці таварыскую сустрэчу па міні-футболе.**



Які ж падлетак адмовіцца ад спаборніцтваў, ад таго, каб даказаць, што менавіта ён у гэтай справе лепшы і мацнейшы. А тут яшчэ футбольная гульня супраць строгіх “дзядзькаў у пагонах”, якіх ужо прывык асцерагацца. Таму выклік прынялі з задавальненнем.

З аднолькавым азартам мяч ганялі і дарослыя міліцыянеры, якія дзеля такога выпадку змянілі пагоны на футбольную форму, і падлеткі, вельмі задаволеныя такой гульнёй на роўных. Дадавалі духу спаборніцтву і актыўныя балельшчыкі (запрасілі навучэнцаў школ і ліцэя, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх). У выніку сустрэчы крыху больш ачкоў набрала каманда РАУС. Але гэта ніколькі не пакрыўдзіла падлеткаў, якія будуць актыўна рыхтавацца да матчу-рэваншу, нават адразу пацікавіліся, калі адбудзецца чарговая спартыўная баталія. Парадавалі ўдзельнікаў і салодкія прызы ад раённага камітэта БРСМ, якія атрымалі ўсе без выключэння.

НАЧНЫ РЭЙД

## Танцулькі “на рагах”

**Рэйд па месцах масавага адпачынку моладзі, які правялі сумесна інспекцыя па справах непаўналетніх, аддзел па справах моладзі райвыканкама і камісія па справах непаўналетніх, атрымаўся багатым на “ўлоў” і вельмі палохаючым з пункту гледжання агульначалавечага. Толькі некалькі гарадскіх і сельскіх клубаў удалося наведаць уночы з суботы на нядзелю, але і гэта дазволіла зрабіць пэўныя вывады.**

Па-першае, цікавіла наяўнасць на дыскатэках непаўналетніх. Трэба было бачыць, як плакаў п’янымі слязьмі дзясяцікласнік адной з гарадскіх школ: “Не стаўце мяне на ўлік, калі ласка. Мне ж яшчэ паступаць…” Так і хочацца спытацца, чым думаў ты і куды глядзелі твае бацькі, калі ішоў на начную дыскатэку і браў у рукі бутэльку са спіртным. З дыскатэкі ў Суцькаве дзвюх васьмікласніц даставілі дахаты ў Наваспаск “з камфортам” - у суправаджэнні міліцыі. Прычым бацькоў месцазнаходжанне іх дачок у начны час невядома дзе і ў якой кампаніі ніколькі не здзівіла, толькі папрасілі, каб дзяўчат не ставілі на ўлік. На першы раз красунь перадалі бацькам пад распіску.

Дыскатэку ў Бялкоўшчыне на гэты раз прыйшлося ўвогуле спыніць, бо большасць наведвальнікаў (непаўналетніх таксама) не тое што танцаваць, хадзіць толкам не маглі - настолькі былі п’яныя. Бутэлькі ад розных “гарачых” напояў былі раскіданыя нават у памяшканні клуба.

Падлеткаў, якія пападаюцца пасля 22 гадзін ды яшчэ “пад мухаю”, чакае мала прыемнага. “Візіт” у райаддзел міліцыі, выклік бацькоў, састаўленне пратакола, медыцынская праверка на прадмет алкаголю ў крыві… Як вынік - пастаноўка на ўлік. Цвярозыя аматары начных гулянняў і іх бацькі на першы раз абыдуцца вуснай размовай і папярэджаннем.

Не застануцца без пакарання і арганізатары дыскатэк, на якія былі дапушчаны ў начны час непаўналетнія. Мінімальная сума штрафу для іх - 20 базавых велічынь. Дарэчы, і бармэны, і прадаўцы, якія прадалі алкаголь непаўналетнім, панясуць таксама адміністрацыйную адказнасць.

Удзельнікі рэйду звярнулі ўвагу арганізатараў забаўляльных мерапрыемстваў, што ў іх задачу ўваходзіць не толькі адчыніць дзверы і ўключыць музыку. Акрамя забеспячэння парадку, яны павінны паклапаціцца пра культурны ўзровень дыскатэкі, тэматычнае напаўненне. Але пра гэта вельмі часта проста “забываюцца”.

Аналагічныя рэйды будуць праводзіцца досыць часта. Магчыма, хоць страх перад адказнасцю прымусіць бацькоў звярнуць увагу на тое, дзе забаўляюцца іх непаўналетнія дзеці. А дзеці ў сваю чаргу задумаюцца, ці каштуюць некалькі гадзін сумніўнага задавальнення пастаноўкі на ўлік у міліцыі.

## Спатканні прызначаем на катку



**На гарадскім катку знаходзіцца месца і аматарам фігурнага катання, і хакеістам.**



**Студэнты Аляксандр ВАЛУЕВІЧ і Вольга АНІСЕНКА пасля паспяховай здачы сесіі з задавальненнем бавяць час на каньках.**

Даўно пазіралі смаргонцы ў бок галоўнага гарадскога катка, дакладней, месца, на якім гэты каток павінен быць. Ды не дазваляла надвор’е парадавацца гэтаму, бадай, самаму любімаму з зімовых відаў адпачынку - катанню на каньках. Але толькі прыцерушыў сняжок зямлю, толькі ўдарыў добры марозік, заззяў наш каток ледзяным люстэркам. І першыя наведвальнікі адразу падцягнуліся, калі добра ўсё падмерзла. А апошнімі днямі, як пачаліся канікулы ў студэнтаў, асабліва вечарамі і па выхадных, каток стаў асноўным месцам сустрэчы моладзі. А гэта не можа не радаваць!

Многія прыходзяць са сваімі канькамі, але і пункт пракату ніколі не пустуе. Тут знойдуцца “вастраносыя” на любы памер, а яшчэ прапануюць і лыжы. Смаргонцы ахвотна карыстаюцца гэтымі паслугамі.

На лёд пакуль што ніхто не скардзіцца: чысціцца ён штодзень пасля выхаду з катка апошніх наведвальнікаў, пастаянна заліваюцца вадой ямкі.

Дзве гадзіны ў дзень на катку трэніруецца хакейная каманда. Але і ў іх хутка будзе асобнае месца - каробка па вуліцы Гагарына. У бліжэйшыя дні зальюць каток у мікрараёне Заходні.

Старонку падрыхтавала Віялета ВОЙТКА. Фота Міхаіла РАЗУМНІКА.